# КРАСА АЙЧЫНЫ

Беларуская акадэмія выяўленчага мастацтва
Нацыянальны музей гісторыі і культуры Беларусі

# КРАСА АЙЧЫНЫ

Прысвячаецца
750-годдзю каранацыі Мендоўга

Каталог-даведнік

Менск
2003













Выстава *«Краса Айчыны»* –сёмая па ліку, якую ГА *«Беларуская акадэмія выяўленчага мастацтва»* ладзіць штогод ад свайго заснавання. Выстава этапная, пасля чарговага Агульнага Сходу акадэмікаў. Абраны новы склад Прэзідыума, вызначаны канкрэтныя шляхі развіцця БелАВМ.

Выставачная дзейнасць застаецца найбольш адметнай рысай правадзейных сяброў Акадэміі. За прамінулыя 4 гады яны ўзялі ўдзел у 214 выставах (персанальных і калектыўных). Такім чынам выконваецца іх прафесійны абавязак перад Бацькаўшчынай. Уласнымі творамі акадэмікі адказваюць на істотнае пытанне – існаванне школы сучаснага беларускага мастацтва і прысутнасць яе ў свеце. Пашыраецца геаграфія саміх выстаў у Беларусі. З творамі мастакоў пазнаёміліся жыхары Багданава, Баранавіч, Барысава, Брэста, Валожына, Гальшанаў, Гомеля, Гродна, Ліды, Магілёва, Светлагорска. За межамі краіны прайшлі выставы ў Аўстрыі, Балгарыі, Бельгіі, Галандыі, Грэцыі, ЗША, Італіі, Іспаніі, Кітаі, Летуве, Нарвегіі, Нямеччыне, Польшчы, Расеі, Славеніі, Славакіі, Францыі, Чэхіі, Японіі і інш.).

Персанальныя галерэі акадэмікаў Г. Вашчанкі і Л. Шчамялёва адкрыты ў Гомелі і Менску. Рашэннем Прэзідыума заснаваны Музэй БелАВМ у Ракаве на сядзібе братоў Янушкевічаў. У ім можна азнаёміцца з творамі акадэмікаў і культурай рэгіёна.

Выстава *«Краса Айчыны»* працягвае традыцыю экспанавання прац нашых стыпендыятаў і дыпламантаў разам з творамі акадэмікаў. Прафесійнае сталенне, пошукі і духоўная скіраванасць нашай моладдзі надае ўпэўненасць у будучыні мастацтва краіны.

Выстава *«Краса Айчыны»* лучыць працы мастакоў трох пакаленняў – творцаў, якія сфармалі сучасную беларускую школу, і якім ёсць што сказаць сваімі новымі працамі гледачу, даць імпульс для роздуму і веру ў спраўджанасць абранага шляху.

*Фелікс ЯНУШКЕВІЧ*



## Леў АЛІМАЎ

Акадэмік графікі Беларускай акадэміі выяўленчага мастацтва.

Нарадзіўся ў 1945 годзе. 1970 – скончыў Маскоўскае мастацкае вучылішча «Памяці 1905 года». Удзельнік шматлікіх нацыянальных і міжнародных мастацкіх выстаў. 1990 – дыплом Міжнароднай біенале графікі ў Калініградзе (Расія). 1992 – прэмія Міжнароднай выставы графікі «Міні-прынт» (Каліфорнія, ЗША). 1992 – Інтэрнацыянальным Біяграфічным Цэнтрам названы «Чалавекам года», узнагароджаны дыпломам «За творчыя дасягненні ў XX стагоддзі» (Кембрыдж, Вялікабрытанія). 1995 – 3 прэмія 1-й Міжнароднай трыенале гравюры (Токіо, Японія). 1998 – медаль і дыплом 17-й Міжнароднай біенале сучаснага экслібрыса (Мальборк, Польшча).

Леў Алімаў – с вялікай павагай
Валодзю Лукашуку.
Мінск, 20.VIII.03г.

«Тры аблокі», 1998, афорт, акватынта



## Міхась БАРАЗНА



Акадэмік мастацтвазнаўства Беларускай акадэміі выяўленчага мастацтва.
Кандыдат мастацтвазнаўства, дацэнт.

Нарадзіўся 20 лістапада 1962 .
У 1985 скончыў Беларускі дзяржаўны тэатральна-мастацкі інстытут.
У 1991 скончыў аспірантуру пры Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў.
З 1986–1992 мастацкі рэдактар выдавецтва «Беларусь».
З 1992 года — на выкладчыцкай працы ў Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў.

З серыі «Рух», 1997-2003, ч. б. фота, 30х40





## Анатоль БАРАНОЎСКІ

Акадэмік жывапісу Беларускай акадэміі выяўленчага мастацтва.
Заслужаны дзеяч мастацтваў Рэспублікі Беларусь,
лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Рэспублікі Беларусь,
прафесар Беларускай акадэміі мастацтваў.

Нарадзіўся ў 1937 г. у Менску. 1958 – скончыў Менскае мастацкае вучылішча. 1965 – скончыў Беларускі дзяржаўны тэатральна-мастацкі інстытут, пачынае ўдзельнічаць у мастацкіх выставах. 1981 – удзельнік Міжнароднага пленэру ў Балгарыі. 1996, 1997 – удзельнік I і II Міжнародных пленэраў імя В. Бялыніцкага-Бірулі (Магілёў).

«Ля возера», 1999 г. палатно, алей, 71x73





## Уладзімір ВІШНЕЎСКІ

Акадэмік графікі Беларускай акадэміі выяўленчага мастацтва.
Віцэпрэзідэнт Беларускай акадэміі выяўленчага мастацтва,
дацэнт па спецыяльнасці «Мастацтва».

Нарадзіўся 17 лютага 1955 г. у вёсцы Балочыцы Слуцкага раёна. 1966–1973 – вучыўся ў Рэспубліканскай школе-інтэрнаце па музыцы і выяўленчым мастацтве. 1979 – скончыў Беларускі дзяржаўны тэатральна-мастацкі інстытут, аддзяленне графікі. З 1988 – на выкладчыцкай працы ў Беларускай акадэміі мастацтваў, сябра Беларускага саюза мастакоў. Работы ў галіне кніжнай графікі адзначаны дыпломамі конкурсаў «Мастацтва кнігі».

«Карона Миндоўга», 2003 г.
афорт, акватынта, 65x33





## Сяргей ГРЫНЕВІЧ

Акадэмік жывапісу Беларускай акадэміі выяўленчага мастацтва.

Нарадзіўся 25 лютага 1960 года у пасёлку Краснасельскі Гродзенскай вобласці. У 1978 скончыў Рэспубліканскую школу-інтэрнат па музыцы і выяўленчаму мастацтву. У 1983 скончыў Беларускі дзяржаўны тэатральна-мастацкі інстытут (аддзяленне манументальнага жывапісу). Удзельнік шматлікіх рэспубліканскіх і міжнародных выстаў. Правёў больш за дваццаць персанальных выстаў.

«Рыбалоўная архаіка», 2002, палатно, алей, 97x130



## Уладзімір ЗІНКЕВІЧ



Акадэмік жывапісу Беларускай акадэміі выяўленчага мастацтва. Віце-прэзідэнт Беларускай акадэміі выяўленчага мастацтва, дацэнт па спецыяльнасці «Мастацтва», Загадчык кафедры манументальна-дэкаратыўнага мастацтва Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў.

Нарадзіўся 23 студзеня 1951 г. у пасёлку Стралічава Хойніцкага раёна Гомельскай вобласці. 1977 – скончыў Беларускі дзяржаўны тэатральна-мастацкі інстытут. 1981 – сябра Беларускага саюза мастакоў. Міжнародны семінар «Мастацтва – майстар-клас» у «Фахверке». 1996 – персанальная выстава ў галерэі «Традыцыя», г. Светлагорск. «Мастацтва ў парку» – Міжнародная мастацкая акцыя-пленэр Rheda Wiedebrueck (Германія). 1997 – персанальная выстава ў галерэі «Мастацтва», Мінск.

«Начное купанне», 1999 г., палатно, тэмпера, 80x95





## Уладзімір ПАНЦЯЛЕЕЎ

Акадэмік скульптуры Беларускай акадэміі выяўленчага мастацтва.

Нарадзіўся ў 1957 г. у вёсцы Навасёлкі Бялыніцкага раёна Магілёўскай вобласці. З 1976 па 1983 гг. вучыўся ў Рэспубліканскай школе-інтэрнаце па музыцы і выяўленчым мастацтве.
1989 – скончыў Беларускі дзяржаўны тэатральна-мастацкі інстытут, аддзяленне скульптуры.
1985 – пачаў удзельнічаць у мастацкіх выставах.
1991 — сябра Саюза мастакоў Беларусі.
Удзельнік шматлікіх рэспубліканскіх і замежных выстаў.

«Чырвоны конь», 2001, чырвонае дрэва, 56x23x12



## Мікалай СЕЛЯШЧУК



Акадэмік жывапісу Беларускай акадэміі выяўленчага мастацтва, заслужаны дзеяч мастацтваў Беларусі.

Нарадзіўся 4 жніўня 1947 г. у вёсцы Вялікарыта Брэсцкай вобласці. 1976 – скончыў Беларускі дзяржаўны тэатральна-мастацкі інстытут. Дыпломная работа – ілюстрацыя да кнігі А. Якімовіча «Кастусь Каліноўскі». Кніжная графіка М. Селяшчука неаднаразова адзначалася дыпломамі вышэйшай ступені рэспубліканскіх і ўсесаюзных конкурсаў «Мастацтва кнігі». 1977 – дыплом і прэмія Міністэрства культуры СССР. 1989 – узнагароджаны медалём «Залаты яблык» і дыпломам Міжнароднай біенале кніжнай ілюстрацыі (Браціслава, Славакія) за афармленне кнігі «Індыкала-кудыкала» Р. Барадуліна. 1992 – Інтэрнацыянальным біяграфічным цэнтрам узнагароджаны медалём «За дасягненні ў XX стагоддзі» (Кембрыдж, Вялікабрытанія). 1993 – прэмія «Чалавек года» ў намінацыі «Выяўленчае мастацтва» (Мінск). 1995 – Рэспубліканская прэмія года «Сустрэчы на Раство».

«Час лагоды і спакою», 1989 г. палатно, алей, 35x40





## Рыгор СІТНІЦА

Акадэмік графікі Беларускай акадэміі выяўленчага мастацтва.

Нарадзіўся 1 студзеня 1958 г. у вёсцы Курыцічы Петрыкаўскага раёна Гомельскай вобласці.
З 1971 па 1976 гг. вучыўся ў Рэспубліканскай школе па музыцы і выяўленчым мастацтве.
У 1982 г. скончыў Беларускую дзяржаўную акадэмію мастацтваў (БДТМІ). З 1983 г. выкладчык Беларускага каледжа мастацтваў. У 1985 г. прыняты ў Беларускі саюз мастакоў.
З 1980 г. удзельнік шматлікіх рэспубліканскіх і міжнародных выстаў, мастацкіх імпрэзаў.



«Замак 5», 1999 г.
палатно, тэмпера, 90x90

## Георгій СКРЫПНІЧЭНКА



Акадэмік жывапісу Беларускай акадэміі выяўленчага мастацтва.

Нарадзіўся ў 1940 г. 1965 – удзел у першай мастацкай выставе.
1966 – скончыў Менскае мастацкае вучылішча.
З 1972 г. – сябра Беларускага саюза мастакоў.
Удзельнік шматлікіх рэспубліканскіх і міжнародных выстаў.

«Археалагічныя зьявы», 2002, палатно, алей, 90x125



## Валерый СЛАВУК



Акадэмік графікі Беларускай акадэміі выяўленчага мастацтва, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі.

Нарадзіўся ў 1947 г. у Коханаве Віцебскай вобласці. Скончыў у 1977 г. Беларускі дзяржаўны тэатральна-мастацкі інстытут. 1978–1980 – стыпендыя Саюза мастакоў СССР. 1978 – уступіў у Маладзёжнае аб'яднанне пры Саюзе мастакоў БССР. З 1980 – сябра Беларускага саюза мастакоў. 1983 – Дыплом VI Талінскай трыенале графікі. 1993 – Лаўрэат прэміі прафсаюзаў Беларусі. Удзельнік і лаўрэат шматлікіх конкурсаў «Мастацтва кнігі».

«Дыялог», 2000, туш, пяро, 60х80



## Павел ТАТАРНІКАЎ



Акадэмік графікі Беларускай акадэміі выяўленчага мастацтва.
Вучоны сакратар Беларускай акадэміі выяўленчага мастацтва.

Нарадзіўся 23.07.1971 г. ў Брэсце. З 1982 па 1989 гг. вучыўся ў Рэспубліканскай школе-інтэрнаце па музыцы і выяўленчым мастацтве. У 1995 г. скончыў Беларускую дзяржаўную акадэмію мастацтваў, аддзяленне графікі. З 1997 г. сябра Беларускага саюза мастакоў. 2000 — Адзначэнне Беларускай акадэміі выяўленчага мастацтва. 1999 — плакета «Залатое пяро». Міжнароднае біенале «Залатое пяро Белграда» (Югаславія). 2000 — Гран-Пры конкурса «Мастак і кніга». 2001 — прыз «Залаты яблык». Міжнароднае біенале ілюстрацыі «BIB—2001» ў Братыславе (Славакія). 2003 — прэмія «Лепшае выданне года» на конкурсе «Мастацтва кнігі».

Ілюстрацыя да кнігі «Песня аб паходзе Ігара» ў перакладзе Я. Купалы, акварэль, папера, 2003, 20х20





## Уладзімір ТОЎСЦІК

Акадэмік жывапісу Беларускай акадэміі выяўленчага мастацтва, прафесар, заслужаны дзеяч мастацтваў Беларусі, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі.

Нарадзіўся ў 1949 г. у Менску. У 1972 — скончыў Беларускі дзяржаўны тэатральна-мастацкі інстытут. 1972 — пачаў удзельнічаць у выставах. 1973—1976 — стажыраваўся ў творчых майстэрнях Акадэміі мастацтваў СССР у г. Баку (Азербайджан). 1976 — сябра Саюза мастакоў Беларусі. 1982 — лаўрэат прэміі камсамола Беларусі. Загадчык кафедры малюнка Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў.
1996 — 2-я прэмія ААН «Хабідат-2», г. Менск.

«Партрэт Д. Галімбіеўскай», 2003, палатно, алей, 80x100



## Юрась ХІЛЬКО



Акадэмік графікі Беларускай акадэміі выяўленчага мастацтва.

Нарадзіўся 13 лютага 1960 г. у Баранавічах. З 1986 пачаў удзельнічаць у мастацкіх выставах. 1990 – лаўрэат прэміі Міжнароднага фонда славянскага пісьменства імя св. Кірыла і Мяфодзія. З 1993 – сябра Беларускага саюза мастакоў. З 1995 – на выкладчыцкай працы на кафедры графікі Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў.

«Шпацыруючая вежа», 2000, папера, акрыл, 55x75



Леанід ШЧАМЯЛЁЎ



Акадэмік жывапісу Беларускай акадэміі выяўленчага мастацтва.
Народны мастак Беларусі,
заслужаны дзеяч мастацтваў Беларусі,
лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі.

Нарадзіўся 5 лютага 1923 г. у Віцебску. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны.
1958 – пачаў удзельнічаць у мастацкіх выставах.
1959 – скончыў Беларускі дзяржаўны тэатральна-мастацкі інстытут.
З 1959 – сябра Беларускага саюза мастакоў. 1983 – узнагароджаны медалём «За дасягненні ў XX стагоддзі» (Кембрыдж, Вялікабрытанія).
Удзельнік шматлікіх рэспубліканскіх і міжнародных выстаў.
1998 – узнагароджаны «Залатым медалём» БелАВМ.
2003 – узнагароджаны «Сярэбраным пярсцёнкам» БелАВМ.

«Навальніца ў Ракаве», 1998, палатно, алей



Юрась ЯКАВЕНКА



Акадэмік графікі Беларускай акадэміі выяўленчага мастацтва.

Нарадзіўся ў Прыморскім краі ў 1965 г. Вучыўся ў Рэспубліканскай школе-інтэрнаце па музыцы і выяўленчым мастацтве. 1988 — пачаў удзельнічаць у выставах. 1992 — скончыў Беларускую акадэмію мастацтва, аддзяленне графікі. 1991—1993 — мастак-пастаноўшчык анімацыйнага фільма «Месяц», студыя «Беларусьфільм». 1994 — сябра Саюза мастакоў Беларусі.
Гран-Пры на II міжнародным біенале графікі, (Хаціва, Іспанія).

«Пегас», 1997,
афорт, меццатынта, 49x32





## Валер'ян ЯНУШКЕВІЧ

Акадэмік скульптуры Беларускай акадэміі выяўленчага мастацтва.

Нарадзіўся 16 снежня 1962 г. у Ракаве Менскай вобласці. 1974–1981 – вучоба ў Рэспубліканскай школе-інтэрнаце па музыцы і выяўленчым мастацтве. 1982 – пачаў удзельнічаць у мастацкіх выставах. 1987 – скончыў Беларускі дзяржаўны тэатральна-мастацкі інстытут, аддзяленне скульптуры. 1987–1991 – праца ў Творчых майстэрнях Акадэміі мастацтваў СССР у Менску. З 1987 г. – сябра Беларускага саюза мастакоў.

«Mindouh 1253 REX», 2003,
рэльеф, бронза, ліццё, 45x40






## Фелікс ЯНУШКЕВІЧ

Акадэмік жывапісу Беларускай акадэміі выяўленчага мастацтва.
Прэзідэнт Беларускай акадэміі выяўленчага мастацтва.

Нарадзіўся 30 мая 1954 г. у Ракаве Валожынскага раёна Менскай вобласці. 1965–1972 – вучоба ў Рэспубліканскай школе-інтэрнаце па музыцы і выяўленчым мастацтве. 1978 – скончыў Беларускі дзяржаўны тэатральна-мастацкі інстытут. 1976 – пачаў удзельнічаць у мастацкіх выставах. 1981 – скончыў аспірантуру Інстытута мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору АН БССР. 1981–1984 – праца ў Творчай майстэрні жывапісу Акадэміі мастацтваў СССР у Менску. З 1984 г. – сябра Беларускага саюза мастакоў. Удзельнік шматлікіх рэспубліканскіх і міжнародных выстаў.

«Менскі матыў», 2002, палатно, алей, 100x120





## Юрась АЛІСЕВІЧ



Дыпламант Беларускай акадэміі выяўленчага мастацтва.

Нарадзіўся 15.12.1970 г. ў Менску.
З 1982 па 1989 гг. вучыўся ў Рэспубліканскай школе-інтэрнаце па музыцы і выяўленчым мастацтве.
У 1995 г. скончыў Беларускую дзяржаўную акадэмію мастацтваў, аддзяленне графікі.
1995 — Адзначэнне Беларускай акадэміі выяўленчага мастацтва.
З 1997 — сябра Беларускага саюза мастакоў.
1997, 1999, 2000, 2003 — дыпломы конкурса «Мастак і кніга».
Удзельнік шэрагу рэспубліканскіх і міжнародных выстаў.
З 1999 — на выкладчыцкай працы ў Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў.



«Гульня ў хованкі»,
1998, ляўкас, тэмпера, 20х30

## Яна АЛЯКСЕЕВА



Дыпламант Беларускай акадэміі выяўленчага мастацтва.

Нарадзілася 11.09.1979 г. ў Брэсце.
У 1994 г. скончыла мастацкую школу ў Менску.
З 1994 па 1997 г. вучылася ў Менскім каледжы мастацтваў.
У 2003 г. скончыла Беларускую акадэмію мастацтваў, аддзяленне графікі.
2003 — Адзначэнне Беларускай акадэміі выяўленчага мастацтва.
З 1995 г. удзельніца шэрагу рэспубліканскіх і замежных выстаў.

Аркуш з нізкі «Хроніка блукаючага тэатра», 2003, афорт





## Уладзімір КАНДРУСЕВІЧ

Стыпендыят Беларускай акадэміі выяўленчага мастацтва.

Нарадзіўся ў 1976 г. ў Менску.
З 1993 па 1999 г. вучоба ў Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў, аддзяленне манументальнага жывапісу.
2001 — стажыроўка ў Фларэнцыі (Італія).
З 1999 г. сябра Беларускага саюза мастакоў.
З 1994 г. удзельнічае ў выставах.
Аўтар манументальных праектаў на Беларусі і за мяжой.
1998 — стыпендыя Беларускай акадэміі выяўленчага мастацтва.

«Без назвы». 2003, палатно, алей, 105x90





## Вольга МАРЧАНКА

Дыпламант Беларускай акадэміі выяўленчага мастацтва.

Нарадзілася 1.01.1976 г. у Менску.
У 2000 скончыла Беларускую дзяржаўную акадэмію мастацтваў, аддзяленне графікі.
Удзельніца міжнародных і рэспубліканскіх выстаў.
2000 — Адзначэнне Беларускай акадэміі выяўленчага мастацтва.

«Лес», 2000, афорт, 41x25



## Уладзімір РУТКОЎСКІ



Стыпендыят Беларускай акадэміі выяўленчага мастацтва.

Нарадзіўся 6 сакавіка 1977 года
ў горадзе Менску.
З 1995 па 1999 вучоба ў менскай мастацкай вучэльні імя Глебава на адзяленні скульптуры.
З 1999 года — студэнт Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў, адзялення скульптуры.
2001 — стыпендыя Беларускай акадэміі выяўленчага мастацтва.

Эскіз помніка Фердынанду Рушчыцу.



## Андрэй САВІЧ




Дыпламант і стыпендыят Беларускай акадэміі выяўленчага мастацтва.

Нарадзіўся 26.10.1974 г. ў Мінску.
1992 — скончыў Рэспубліканскую школу-інтэрнат па музыцы і выяўленчаму мастацтву.
1998 — скончыў Беларускую дзяржаўную акадэмію мастацтваў, аддзяленне манументальна-дэкаратыўнага мастацтва.
1996 — стыпендыя Беларускай акадэміі выяўленчага мастацтва.
1998 — Адзначэнне Беларускай акадэміі выяўленчага мастацтва.

«Разам», 2002, палатно, акрыл, 70Х60





## Дзяніс СІНЮГІН

Дыпламант і стыпендыят Беларускай акадэміі выяўленчага мастацтва.

Нарадзіўся ў 1973 г. ў Гомелі.
1992 — скончыў Рэспубліканскую школу-інтэрнат па музыцы і выяўленчаму мастацтву.
1998 — скончыў Беларускую дзяржаўную акадэмію мастацтваў, аддзяленне графікі.
1996 — стыпендыя Беларускай акадэміі выяўленчага мастацтва. 1998 — Адзначэнне Беларускай акадэміі выяўленчага мастацтва.
Удзельнік шэрагу рэспубліканскіх і міжнародных выстаў. Працуе ў тэніках: графіка, жывапіс, фота, відэа, аўтарская тэхніка.

З «Казачнай» серыі. «Лунны бляск», 2003, аўтарская тэхніка, 29Х63



## Тамара ШЭЛЕСТ



Дыпламант і стыпендыят Беларускай акадэміі выяўленчага мастацтва.

Нарадзілася 11.07.1977 г. ў Менску.
У 2001 скончыла Беларускую дзяржаўную акадэмію мастацтваў, аддзяленне графікі.
Удзельніца міжнародных і рэспубліканскіх выстаў.
1998 — прыз рэспубліканскай маладзёжнай выставы «Час, прастора, асоба». 1999 — дыплом «Залаты дубль», выстава «Мастак і кніга» г. Менск. 1996 – стыпендыя Беларускай акадэміі выяўленчага мастацтва.
2001 — Адзначэнне Беларускай акадэміі выяўленчага мастацтва.

«Блізняты», 2002, папера, акрыл, 55х77



## Беларуская акадэмія выяўленчага мастацтва

«Талент і мараль»

прынцыпы дзейнасці Беларускай акадэміі выяўленчага мастацтва (БелАВМ) — Рэспубліканскай грамадскай арганізацыі мастакоў

Асновы акадэміі — яе члены.

У БелАВМ два віды членства:
персанальныя і юрыдычныя асобы.

Па Палажэнні аб выбарах усіх акадэмікаў — 47, у тым ліку:
акадэмікаў жывапісцаў — 17;
акадэмікаў графікаў — 13;
акадэмікаў скульптараў — 9;
акадэмікаў мастацтвазнаўцаў — 5;
акадэмікаў рэстаўратараў — 3.

Зараз у акадэміі абрана 23 акадэмікі. На вакантныя месцы аб'яўляюцца выбары. Дадатковая адзінка ўводзіцца пастановай прэзідэнта Акадэміі. Колькасць прадстаўнікоў юрыдычных асоб і ганаровых акадэмікаў не абмяжоўваецца.

Вышэйшы склад БелАВМ — Прэзідыум.

Крыніцы фінансавання:
статутны фонд (фарміруецца з калекцыі твораў акадэмікаў і іх асабістых складак);
мецэнацтва;
камерцыйная дзейнасць;

ахвяраванні і іншыя крыніцы, дазволеныя заканадаўствам;

усёй выканаўчай дзейнасцю займаецца выканаўчая дырэкцыя, куды ўваходзяць прадстаўнікі юрыдычных асобаў.

Накірункі дзейнасці БелАВМ:
1) кансультатыўны;
2) выставачны;
3) педагагічна-выхаваўчы;
4) навукова-даследчы.

БелАВМ усімі сродкамі падтрымлівае развіццё выяўленчага мастацтва і маладых творцаў.

Рэспубліка Беларусь, 220013, Менск, вул. Сурганава, 42/39.
Тэл./факс: + (375 (0)1772) 52-262;
тэл. +(375 (0)17) 236-34-44; 285-10-55.
e-mail: p_tatarnikov@yahoo.com

Разліковы рахунак: 3015211510012
код 763, Ленінскае аддзяленне ОАО Белбізнесбанка,
Менск, пр-т Партызанскі 22-а.

УНН 100956825. ОКПО 37373084

© Фота на вокладцы – М. Баразна; © Дызайн – Ул. Вішнеўскі, П. Татарнікаў; © Вёрстка – А. Глекаў

